УДК 947.6 «1917»

І. М. Рыжанкоў, асістэнт

# СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ Ў РЭВАЛЮЦЫЯХ 1917 Г.: ЗДАБЫТКІ І СТРАТЫ

In this article there is an analysis of activities of Belarusian peasantry in conditions of formation of a new political system – before the February revolution till the time of an establishment of the Soviet authority.

Расійская імперыя ўступіла ў новы 1917 год ва ўмовах узрастання сацыяльна-палітычнай напружанасці ў грамадстве, выкліканай працяглай вайной, шматлікімі стратамі на франтах, пагаршэннем жыццёвага ўзроўню і інш. Кіруючая дваранска-памешчыцкая эліта на чале з Мікалаем ІІ адзіным выйсцем па пераадоленні ўсіх цяжкасцей лічыла дасягненне поўнай перамогі над Германіяй і яе саюзнікамі. На дасягненне гэтай мэты былі скіраваны сілы 13,5-мільённай арміі [11, с. 20], пераведзеная на ваенныя рэйкі прамысловасць, дзяржаўны апарат, ідэалагічныя (царква, асвета, лаяльная ўраду прэса і г. д.) сродкі і інш.

Напачатку 1917 г. у поўнай меры цяжкасці вайны адчувала вясковае насельніцтва Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай губерняў і Віленскай у складзе Ашмянскага, Вілейскага і Дзісенскага паветаў. Асноўная цяжкасць, якую перажывала як сялянская, так і памешчыцкая гаспадарка – гэта недахоп рабочых рук па прычыне вайсковых мабілізацый [9, спр. 21, л. 49]. Недахоп працоўнай сілы прымушаў землеўладальнікаў і буйных арандатараў здаваць свае палеткі ў арэнду сялянам бліжэйшых вёсак. Беззямельныя сяляне, а таксама бежанцы мелі магчымасць наняцца на працу на выгадных для сябе ўмовах. Гэта акалічнасць абумовіла рост аплаты працы парабкаў і разам з тым змяншала рэнтабельнасць вытворчасці прадукцыі.

Натуральна, што і гэтыя абставіны негатыўна адбіваліся на аб’ёме прадуктаў. Нягледзячы на жорсткую рэгламентацыю жыццядзейнасці прыфрантавых губерняў, законы рынку не былі ёй падуладнымі, што адбівалася ў няспынным узрастанні дэфіцыту і дарагоўлі спажывецкіх тавараў пры прагрэсіраваўшай інфляцыі.

У такіх умовах харчовая справа беларускіх губерняў у многім залежала ад сістэмы цэнтралізаванага дзяржаўнага забеспячэння хлебам, якая стала даваць збоі. Невыпадкова мясцовыя ўлады сталі часцей звяртаць увагу на мясцовыя рэсурсы. Асноўнымі паўнамоцтвамі ў харчовай галіне карысталіся службы губернскіх «упаўнаважаных міністэрства земляробства па нарыхтоўцы хлеба для патрэб арміі» [8, спр. 2, л. 21]. Асобна, але ў кантакце з імі, дзейнічалі губернскія харчовыя камісіі, франтавыя, акруговыя, гарнізонныя інтэнданцтвы і інш.

Пэўная частка хлеба (жыта, аўса і інш.) нарыхтоўвалася на месцах метадам «развёрсткі» па «цвёрдай» цане, прычым самі вяскоўцы дастаўлялі яго ў гарадскія «ссыпныя магазіны» па норме, вызначанай земскімі ўправамі на аснове інфармацыі аб магчымасцях сялянскай гаспадаркі (колькасць зямлі, пашы, жывёлы, едакоў і г. д.) [7, спр. 1, л. 34]. Для рэквізіцый жывёлы прызначаліся тыя гаспадаркі, дзе мелася лішняе, паводле вызначаных нормаў, пагалоўе.

У цэлым, беларускія сяляне не выказвалі прыкметных праяў нецярпімасці да існаваўшых парадкаў. Іх «спажывецкі кошык» не саступаў «кошыку» гарадскіх працоўных або бежанцаў. Сялянства адчувала большую патрэбу ў прамысловых таварах, чым у прадуктовых. Зрэшты, выпадкаў галоднай смерці ў беларускай вёсцы не зафіксавана [5, спр. 4, л. 312].

У апошнія месяцы самаўладдзя з боку сялян не было зарэгістравана ніводнага правапарушэння палітычнага характару, а рэдкія выпадкі аграрнага руху набылі ўстойлівую тэндэнцыю да змяншэння. Але калі першую акалічнасць можна растлумачыць суцэльнай апалітычнасцю сялян, то звязваць спыненне аграрнага руху толькі з эфектыўнасцю ваенна-палітычнага рэжыму было б памылкова. Ва ўмовах вайны кан’юнктура мясцовага рынку складвалася такім чынам, што ўласная гаспадарка і магчымасць заработку ў маёнтках або на казённых аб’ектах гарантавалі сялянам больш рэальныя шанцы падтрымаць свой дабрабыт, чым імкненне зрабіць гэта за кошт панскага дабра.

Відавочна, што сяляне Беларусі, зрэшты, як і ўсёй імперыі, неслі асноўны цяжар вайны, лічачы яе справядлівай, і не выказвалі вострага незадавальнення сваім становішчам. Пазбаўленыя палітычных правоў, за выключэннем «цэнзавай часткі», сяляне прыкметных шкадаванняў аб тым не выказвалі. Тыя ж з іх, хто быў абраны ў Дзяржаўную Думу, не стаў абаронцам ні нацыяльных, ні рэгіянальных інтарэсаў, а трапіў пад уплыў больш спрактыкаваных расійскіх палітычных партый і груповак.

У гэтай сувязі сярод прычын, што абумовілі звяржэнне самаўладдзя, можна дапусціць многія, але ніяк не рэвалюцыйную ці якую іншую актыўнасць сялянства. Мала таго, адразу ж пасля перамогі Лютаўскай рэвалюцыі новай палітычнай эліце сумесна з «рэвалюцыйнай дэмакратыяй» давялося прыкласці шмат намаганняў для таго, каб павярнуць гэтую

актыўнасць у стваральнае, на карысць расійскай грамадскасці і дзяржавы, рэчышча.

У прыватнасці, з падзеннем самаўладдзя Беларусі, як і паўсюдна па краіне, адбывалася ўсталяванне так званага новага ладу, па сутнасці, фарміраванне новай палітычнай сістэмы. Пры падтрымцы Петраградскага Савета дэпутатаў Часовы ўрад абвясціў грамадству задачы рэвалюцыі: рэфармаванне апарату дзяржаўнага кіравання, рэарганізацыя харчовых органаў і рэалізацыя хлебнай манаполіі, падрыхтоўка да аграрнай рэформы, земскія выбары, скліканне Устаноўчага сходу, пераможнае заканчэнне вайны і інш.

Іншая справа, што ў першыя дні сакавіка галоўным клопатам для былых чыноўнікаў дзяржаўнага апарату (акрамя губернатараў і іх намеснікаў, а таксама жандараў), служачых земстваў, гарадскіх самакіраванняў, Усерасійскага земскага саюза, Усерасійскага саюза гарадоў, членаў Камітэтаў грамадскай бяспекі, Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі і іншых арганізатараў новага ладу з'ўлялася недапушчэнне сялянскіх выступленняў супраць чужой маёмасці і наогул парушэнняў грамадскага парадку, што прывяло да зрываў паставак на фронт і дэстабілізацыі на франтах.

Знешне роля і месца сялянства ў працэсе ўсталявання новага ладу былі невыразнымі, але ў плане стварэння сацыяльнай апоры і вырашэння вострай харчовай праблемы яго значнасць узрастала да першых велічынь. Невыпадкова ў сакавіку сацыяльныя паводзіны сялянства, нараўне з працэсамі ў арміі, выклікалі павышаную грамадскую цікавасць.

Стаўленне вяскоўцаў да звергнутага цара характарызавалася пераважна стрыманасцю, а да новай улады ў асобе Часовага ўрада – добразычлівасцю і настроем аказваць яму падтрымку ў асноўных накірунках праграмы. Выпадкі асобных процiпраўных дзеянняў сялян маёмаснага кшталту былі выкліканы паслабленнем улады на пераходным этапе рэвалюцыі, але і яны не былі ўласцівы беларускай вёсцы [13, с. 103].

З атрыманнем усімі грамадзянамі Расійскай імперыі права на фарміраванне ўладных структур з улікам мясцовых асаблівасцей узніклі самыя шматлікія дэмакратычна абраныя органы дзяржаўнай улады – валасныя камітэты. Як правіла, сялянскія па складу, названыя ўстановы займаліся наступнымі пытаннямі: абвяшчэнне і дагляд за выкананнем ўрадавых пастаноў, барацьба з дэзерцірамі і г. д. [1, с. 134, 135]. У меншай ступені вяскоўцы былі прадстаўлены ў павятовых і губернскіх камісарыятах.

Нізкая зацікаўленасць сялян ва ўдзеле ў выбарах валасных камітэтаў абумовіла напачатку недасканалы склад – у сэнсе прадстаўніцтва і вызначэння функцый. І таму з цягам часу гэтыя органы не пазбягалі канфліктаў з існаваўшым заканадаўствам і спадзяваннямі Часовага ўрада. Так, ужо ў маі 1917 г. да камісараў Міншчыны траплялі скаргі аб выданні валаснымі камітэтамі процізаконных пастаноў (дазвол на захоп і размеркаванне памешчыцкіх і казённых сенакосаў, лугоў і г. д.) са спасылкай на рэзалюцыі сялянскіх з'ездаў, якія ўспрымаліся ў якасці законаў [4, спр. 158, л. 11]; [1, с. 380]. Што датычыцца Саветаў сялянскіх дэпутатаў, то яны ў сваёй масе былі створаны па ініцыятыве эсэраўскіх актывістаў, урадавых служачых, салдат і рабочых. За рэдкім выключэннем сяляне не праяўлялі вялікай цікавасці да дзейнасці Саветаў у параўнанні з валаснымі і іншымі камітэтамі. І часцей разглядалі іх як сродак для вырашэння сваіх гаспадарчых пытанняў.

Варта адзначыць, што істотную ролю ў рэарганізацыі сістэмы харчовага забеспячэння краіны павінны былі адыгрываць земляробы і не толькі ў справе рэалізацыі сельгаспрадукцыі. У прыватнасці, адмысловая пастанова ад 25 сакавіка акрэсліла для сялян – у параўнанні з іншымі групамі насельніцтва – найбольшае прадстаўніцтва ў валасных харчовых камітэтах. На апошніх, дарэчы, прыпадала асноўная нагрузка па арганізацыі харчовай справы: улік сельскагаспадарчай прадукцыі, усталяванне тэрмінаў збору ўраджаю – рэалізацыя хлебнай манаполіі [3, спр. 297, л. 132].

Усенародная падтрымка Часовага ўрада спрыяла яго імкненням вырашыць харчовую праблему ў маштабе ўсёй краіны. 11 красавіка з клопатам аб будучым ураджаі ён выдаў пастанову «Аб ахове пасеваў», якая дазваляла харчовым камітэтам здаваць у арэнду пуставаўшыя, у тым ліку памешчыцкія, землі [3, спр. 297, л. 132 адв.]. Неўзабаве яна выклікала значную зацікаўленасць сялянства як магчымасць паляпшэння свайго гаспадарчага становішча.

З самага пачатку абвешчаная ўрадам манаполія на практыцы выявіла супярэчлівае да яе стаўленне з боку сялянства. З аднаго боку, абраныя ім харчовыя камітэты сумленна выконвалі ўскладзеныя на іх абавязкі, а з другога боку, выклікалі незадавальненне хлебаробаў як дзяржаўных органаў на недасканалую ўрадавую палітыку ў харчовым пытанні, што, у прыватнасці, адбівалася ў пераабраннях камітэтаў. У цэлым, вынікі першага этапу сельскагаспадарчага перапісу і хлебанарыхтовак, у тым ліку на Беларусі, давалі ўраду падставы спадзявацца на паспяховы збор новага ўраджаю ў межах манаполіі. У чым пэўную агітацыйна-прапагандысцкую дапамогу аказалі структуры Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

Больш далёкая перспектыва змены гаспадарчага становішча вяскоўцаў за кошт канфіскацыі памешчыцкай маёмасці – у кантэксце рэалізацыі аграрнай рэформы дэпутатамі Устаноўчага сходу – была зацверджана ў пастанове міністра земляробства Шынгарова ад 21 красавіка. Паводле апошняй, ствараліся галоўны, губернскія, павятовыя і валасныя зямельныя камітэты. Іншая справа, што на гэтым этапе новаствораным установам падлягала не дапускаць гвалтоўных падзелаў прыватнай зямлі і рыхтаваць адпаведныя матэрыялы да аграрнай рэформы.

Нягледзячы на тое, што ў маі – пачатку чэрвеня пасля Усерасійскага, губернскіх і павятовых сялянскіх з'ездаў, якія падтрымалі эсэраўскую аграрную праграму сацыялізацыі і заклік правядзення аграрнай рэформы дэпутатамі Устаноўчага сходу, але ў той жа час выказаліся за скасаванне заключаных да 1 сакавіка арэндных здзелак і перадачу ўсіх зямель у распараджэнне зямельным камітэтам, на Беларусі распаўсюдзіліся і набылі масавы характар парубкі лесу, пасьба жывёлы ў лясных урочышчах, захопы панскіх і заарэндаваных сенакосаў і інш. Удзельнікі з'езда, акрамя іншага, падтрымалі зямельную палітыку.

У выніку сітуацыя на вёсцы пачала мяняцца на карысць сялян: памешчыкі гублялі магчымасць дыктаваць свае ўмовы арэнды, расцэнкі і інш. Нават ва ўмовах захавання інстытута прыватнай (у дадзеным выпадку – зямельнай) уласнасці інтарэсы асобных уладальнікаў непазбежна гублялі прыярытэт перад інтарэсамі ўсяго грамадства.

Натуральна, што па меры палітызацыі грамадскага жыцця і пагаршэння эканамічнага становішча ў краіне стваралася пагроза нармальнай падрыхтоўцы аграрнай рэформы. Пэўнае процідзеянне кадэтаў у Міністэрстве земляробства і Галоўнага зямельнага камітэта патрабаванням сялянскіх з'ездаў аб пашырэнні паўнамоцтваў зямельных камітэтаў было пераадолена пасля ліпеньскага ўрадавага крызісу. У прыватнасці, паводле пастановы міністра земляробства В. М. Чарнова ад 12 ліпеня, усе справы па продажу і залогу зямлі траплялі ў распараджэнне губернскіх зямельных камітэтаў [12, с. 1717]. Услед за гэтым 16 ліпеня выйшла ў свет наступная інструкцыя, паводле якой валасныя зямельныя камітэты набывалі права перадачы незапатрабаваных ворыўных зямель і сенакосаў у арэнду сялянам, дагляду за эксплуатацыяй усіх лясоў і інш. [9, спр. 5, л. 90–90 адв., 91].

Са зменай кампетэнцый зямельныя камітэты набылі функцыі ўстановы з правамі дзяржаўнага органа ўлады. Відавочна, што, паводле ўрадавага меркавання, названыя камітэты выконвалі задачу вырашэння інтарэсаў усяго працоўнага сялянства. Цыркуляр Міністэрства ўнутраных спраў І. Цэрэтэлі, разасланы 18 ліпеня, стрымліваў класавую накіраванасць палітыкі міністра Чарнова ў аграрным пытанні, які нагадаў першапачатковыя задачы зямельных камітэтаў – барацьба з правапарушэннямі і захаванне зямельнага фонду ў цэласнасці да склікання Устаноўчага сходу [4, спр. 181, л. 20–21].

Падобныя ўрадавыя рашэнні, скіраваныя на абмежаванне правоў землеўласнікаў, павінны былі спрыяць усталяванню ў вясковым грамадстве пераканання аб непазбежнасці ліквідацыі памешчыцкага землеўладання і перадачы ім зямельнага фонду краіны і адпаведна садзейнічаць рэалізацыі другой важнай праграмы – харчовай.

Разам з тым змяншэнне ў другой палове лета паступлення прадуктаў з губерняў Расіі паставіла пад пагрозу само існаванне хлебнай манаполіі, паколькі ўзрослы попыт на харчаванне правакаваў рост яго рыначных цэн. Пэўныя ў межах асобных рэгіёнаў Беларусі цяжкасці з хлебанарыхтоўкамі адбываліся ў выніку мэтаскіраванай і ненаўмыснай дзейнасці валасных харчовых або сельскіх камітэтаў падчас арганізацыі жніва (у тым ліку сенакосу) у маёнтках і іншых уладаннях, калі сяляне па ўласнай ініцыятыве збіралі чужы ўраджай, а затым патрабавалі за гэта аплату па сваіх расцэнках [10, спр. 1, л. 14].

Адной з прычын, якая падштурхнула вяскоўцаў да ўхілення ад хлебных рэквізіцый, з'явілася альтэрнатыва перагонкі збожжа на самагон і яго продаж па высокіх цэнах. Відавочна, што нават пры чарговым урадавым павышэнні «цвёрдых» цэн на збожжа і іншыя прадукты ўстойлівы попыт вайскоўцаў на алкаголь забяспечваў сялянам такі ж устойлівы прыбытак.

У верасні – кастрычніку харчовая праблема ў арміі і горадзе працягвала абвастрацца. Сялянства парушала дамовы з памешчыкамі і арандатарамі, узятыя абавязацельства па пастаўках фуражу, ухілялася ад рэквізіцый і г. д., паколькі з часу заключэння здзелак цэны імкліва перавышалі абумоўлены кошт [5, спр. 58, л. 405]. У газетах траплялся публікацыі аб цяжкім становішчы арміі і прамыя звароты да сялян аб дапамозе [2]. Што тычыцца пагромных выступленняў вяскоўцаў, то тут яны не мелі такі суцэльны характар, накшталт Казанскай, Курскай і Пензенскай губерняў Расіі. На думку Часовага ўрада, кантроль за грамадскім парадкам, харчовая справа і многае іншае падлягала вырашаць новаабраным – у першыя месяцы восені 1917 г. – земскім гласным [7, спр. 4, л. 17–17 адв.]. Запавольванне земскіх выбараў і ажыццяўленне Кастрычніцкай рэвалюцыі парушылі планы эфектыўнага вырашэн-

ня пастаўленых задач гласнымі (у большасці сяляне) новых устаноў.

Сітуацыя пагоршылася яшчэ больш, калі на франтах у беларускіх губернях пачалася барацьба бальшавікоў за пераход улады да Саветаў. У лістападзе «пагромны рух» назіраўся ва ўсіх губернях Беларусі. Характэрна, што захопныя дзеянні сялян былі скіраваны не на зямельную або лясную ўласнасць памешчыкаў, а на прадукты, інвентар і жывёлу [10, спр. 9, л. 17]. Значную (калі не вызначальную) ролю ў тым адыгрывалі салдаты, пазбаўленыя цэнтралізаванага харчовага забеспячэння [6, спр. 3, л. 62]. Натуральна, што ў мясцовасцях, дзе не было вайсковых часцей, рабаўніцтва сялян не насіла суцэльна знішчальнага характару. Мала таго, каб пазбегнуць магчымага пакарання, вяскоўцы рабавалі панскую маёмасць «скопам», г. зн. усёй грамадой, ускладаючы штраф на тых, хто не хацеў у тым удзельнічаць [1, с. 14, 17].

Такім чынам, Лютаўская рэвалюцыя акрэсліла да выканання шэраг задач. Некаторыя з іх, як харчовая справа і збор ахвяраванняў, тэматычна мелі пэўную пераемнасць з мінулым рэжымам, але ва ўмовах дэмакратычнага ладу іх вырашэнне загучала зусім па-іншаму. Так, удзел земляробаў у харчовых мерапрыемствах царызму абмяжоўваўся здачай сельгаспрадукцыі нарыхтоўчым службам. З рэвалюцыяй сялянства апынулася ў стане непасрэдных праваднікоў, выканаўцаў, адказных за лёс хлебнай манаполіі, а ахвяраванні на карысць фронту атрымалі палітызаваную афарбоўку.

Новыя палітычныя свабоды прадугледжвалі шырокі ўдзел вяскоўцаў у рэарганізацыі і працы дзяржаўных органаў кіравання, у справе справядлівага ажыццяўлення доўгачаканай аграрнай рэформы (зямельныя камітэты і выбары ва Устаноўчы сход), таксама сялянам дазвалялася ствараць грамадскія арганізацыі.

Зразумела, што названыя плыні ажыццяўляліся пад пільным каардынацыйна-ідэалагічным даглядам дзяржаўных і грамадска-палітычных сіл (часцей эсэраў) і павінны былі выконвацца паступова, у кантэксце агульнадзяржаўных задач.

Завышаныя чаканні арганізатараў вёскі на правільнае разуменне земляробамі ўласнай ролі і адказнасці за ўдзел у рэфармаванні краіны напачатку сустрэлі з боку вясковага жыхарства цікавасць і спачуванне. Праўда, не тое адмыслова глыбіннае ўсведамленне, якое спрыяла б паскоранаму развіццю дзяржавы і прасоўванню рэвалюцыі ў стваральным накірунку. Паколькі такія фактары, як аслабленне рэпрэсіўнага апарату ўлады, непаслядоўная, паспешлівая дзейнасць губернскіх і павятовых зямельных камітэтаў на чале з эсэрамі, узмацненне абшчынных і індывідуальных інтарэсаў, адыгралі рашаючую ролю ў выспяванні ў вяскоўцаў імкнення выкарыстаць умовы часу і пэўныя (дзяржаўныя, грамадскія) структуры для свайго ўзбагачэння.

Да таго ж няўпэўненая зямельная палітыка і цяжкасці ажыццяўлення харчовай праграмы, паражэнні на франтах дрэнна адбіваліся на аўтарытэце Часовага ўрада. Неўзабаве, адным з першых вынікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі з'явілася абвяшчэнне дэкрэту аб зямлі, які быў заснаваны на эсэраўскай аграрнай праграме і толькі дэклараваў асноўныя прынцыпы маючай адбыцца рэформы. На справе яе падрыхтоўка на Беларусі пачалася толькі ў снежні 1917 г., прычым у рэчышчы эсэраўскага праекта сацыялізацыі. Нельга не прызнаць і тое, што агульны настрой сялян на ажыццяўленне аграрнай рэформы законным, а не захопным шляхам, істотна пераважаў на вёсцы, аб чым, у прыватнасці, красамоўна сведчыў іх удзел у выбарах кандыдатаў Устаноўчага сходу, а затым і органаў новай, Савецкай улады.

### Літаратура


1. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы: В 2 т. / Редкол.: Г. С. Горбунов, Ф. А. Новиков и др. – Мн., 1957. – Т. 1.
2. День. – 1917, 20 октября.
3. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 1778. Воп. 1. Спр. 297.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 60. Воп. 3. Спр. 158, 181.
5. НАРБ. Ф. 624. Воп. 1. Спр. 4, 58.
6. НАРБ. Ф. 628. Воп. 1. Спр. 3.
7. НАРБ. Ф. 640. Воп. 1. Спр. 1, 4.
8. НАРБ. Ф. 640. Воп. 2. Спр. 1, 4, 21.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусь (НГАБ). Ф. 2086. Воп. 1. Спр. 21, 22.
10. НГАБ. Ф. 2679. Воп. 1. Спр. 1, 5, 9.
11. Россия в мировой войне 1914–1918 гг. (в цифрах). – М., 1925.
12. Собрание узаконений и распоряжений Правительства. За вторую половину 1917 года. – Петроград: Сенатская типография, 1917.
13. 1917 г. в деревне: (Воспоминания крестьян) / Под ред. Я. Л. Яковлева. – М., 1967.